зацыі калгасаў і саўгасаў настойліва ўкаранялі новыя формы працы ў зернявую гаспадарку, там былі дасягнуты і пэўныя поспехі.

[1] Гл.: Материалы Пленума Центрального Комитета КПСС, 25—26 июня 1987 г. М., 1987.
[2] ПА Гомельскага АК КПБ. Ф. 144, воп. 150, спр. 14, л. 293—294, 334—337; ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 4., воп. 126, спр. 2, л. 137.
[3] Гл.: Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК. М., 1986. С. 192.
[4] ПА Брэсцкага АК КПБ. Ф. 1, воп. 50, спр. 48, л. 83—84; Воп. 56, спр. 6, л. 84—85.
[5] Там жа. Ф. 4500, воп. 1, спр. 38, л. 102—110.
[6] Гл.: Советская Белоруссия. 1980. 2 июля.
[7] ПА Гомельскага АК КПБ. Ф. 144, воп. 165, спр. 22, л. 123—124; ПА Віцебскага АК КПБ. Ф. 1, воп. 142, спр. 32, л. 87—88.
[8] ПА Гомельскага АК КПБ. Ф. 144, воп. 160, спр. 68, л. 22, 60—65; Механизаторский подряд в земледелии. Минск, 1984. С. 46.
[9] Гл.: Правда. 1983. 11 марта.
[10] Гл.: Хусаинов Ю. М. На пути к большому хлебу. Минск, 1985. С. 317.
[11] Там жа. С. 328.

А. Г. КАХАНОЎСКІ

## ДА ПЫТАННЯ АБ САЦЫЯЛЬНАЙ ТЫПАЛОГІІ ПАВЕТАЎ БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XIX СТАГОДДЗЯ

У савецкай гістарычнай літаратуры дастаткова поўна асветлена развіццё Беларусі ў перыяд капіталізму, ахарактарызаваны асноўныя рысы сацыяльна-класавай структуры насельніцтва. Развіццё сельскагаспадарчага насельніцтва, наёмных рабочых як сацыяльных груп дадзена ў дынаміцы. Аднак прыйшоў час замест агульнага апісання сацыяльна-класавай структуры насельніцтва ўсёй Беларусі перайсці да падрабязнай характарыстыкі гэтай структуры, вылучэння розных яе тыпаў па рэгіёнах, што дазволіць паказаць сацыяльна-дэмаграфічную структуру рэспублікі аб'ёмна, рэльефна. Выкананне задачы прадугледжвае ажыццяўленне разам з дэталізацыяй адваротнай ёй даследчыцкай аперацыі — тыпалагізацыі аб'ектаў вывучэння, што ў дадзеным выпадку зводзіцца да вызначэння груп адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, якія маюць падабенства па істотных адзнаках. На аснове традыцыйных гістарычных метадаў магчыма пабудова тыпалогіі аб'ектаў даследавання па адным-двух паказчыках, але, калі іх значна больш, то пры выкананні такой работы не абысціся без выкарыстання шматмернага статыстычнага аналізу і ЭВМ. Пры дапамозе апошніх і праведзена тыпалагізацыя паветаў Беларусі па сацыяльна-класавай структуры іх насельніцтва ў канцы XIX стагоддзя (кластэрны аналіз), а таксама ўдакладнены ўзаемасувязі розных кампанентаў гэтай структуры (карэляцыйны, рэгрэсіўны аналіз)[1].

Крыніцазнаўчую аснову для даследавання склалі пагубернскія выданні матэрыялаў усеагульнага перапісу насельніцтва Расіі 1897 года, звесткі ваенна-конскага перапісу 1900 года, а таксама паказальнік «Фабрично-заводская промышленность России: Перечень фабрик и заводов» (СПб., 1897)[2]. Трэба адзначыць, што дадзеныя гэтых крыніц маюць у большасці ўскоснае дачыненне да сацыяльна-класавай структуры грамадства. Таму асновай вылучэння і колькаснага вызначэння паказчыкаў, неабходных для пабудовы тыпалогіі беларускіх паветаў, з'явілася статыстыка заняткаў насельніцтва, якая, паводле заўвагі У. І. Леніна «...можа і павінна быць скарыстана для **прыблізнага** вызначэння таго, на якія **асноўныя** катэгорыі падзяляецца ўсё насельніцтва Расіі па свайму **класаваму** становішчу, г. зн. па свайму становішчу ў грамадскім ладзе вытворчасці»[3].

З улікам магчымасцей крыніц намі выдзелена 20 паказчыкаў, якія адлюстроўваюць удзельную вагу розных сацыяльных груп грамадства[4]. Найважнейшымі для фарміравання комплексу прызнакаў аказаліся патрабаванні прадстаўнічасці іх і змястоўнай яснасці. Для вызначэння падобных па 20 адзнаках паветаў быў выкарыстаны агламерацыйна-іерархічны метад кластэрнага аналізу. Асноўная ідэя яго знаходзіцца «...у паслядоўным аб'яднанні групуемых аб'ектаў — спачатку самых блізкіх, затым больш далёкіх адзін да аднаго. Працэс пабудовы класіфікацыі складаецца з паслядоўнасці крокаў, на кожным з якіх адбываецца аб'яднанне двух бліжэйшых аб'ектаў (кластэраў)»[5].

У працэсе апрацоўкі матрыцы зыходных дадзеных, якая ўключае 35 радкоў (па колькасці паветаў) і 20 слупкоў (па колькасці паказчыкаў), і гісторыка-змястоўнай інтэрпрэтацыі яе вынікаў вылучана 9 груп (кластэраў) паветаў. Аднак з мэтай адыходу ад празмернай дэталізацыі тыпалогія паветаў Беларусі па сацыяльна-класавай структуры насельніцтва і характарыстыка асноўных рыс іх груп у артыкуле даецца на ўзроўні больш буйных структурных фарміраванняў-тыпаў, якія аб'ядноўваюць некалькі (магчыма і адзін) блізкіх па сваіх адзнаках кластэраў. Вызначаны чатыры тыпы паветаў [6] (гл. табл. 1). У першы з іх увайшлі тэрытарыяльныя адзнакі першай групы. Яны ўключаюць найбольш буйныя адміністрацыйныя цэнтры Беларусі, што адлюстравалася на сацыяльна-класавай структуры насельніцтва. Для гэтага тыпу ўласцівы найбольш высокі працэнт непрадукцыйных пластоў грамадства — чыноўнікаў і ваеннаслужачых (14,16 %), прадстаўнікоў вольных прафесій (прыватная юрыдычная, урачэбная дзейнасць, навука, літаратура і інш.), ранцье (3,08 %) пенсіянераў (2,92 %), паслугі, падзёншчыкаў. У паветах гэтай групы была меншай за астатнія доля занятых у сельскагаспадарчай вытворчасці (гл. табл. 2), адзначана таксама прыкметная палярызацыя сялянства і найбольш высокі ўзровень працэсу «рассяляньвання». Акрамя таго, тут быў максімальны (у параўнанні з другімі паветамі) працэнт пісьменнага насельніцтва.

Табліца 1

**Склад кластэраў і тыпаў паветаў Беларусі**

| Кластэры | Назва паветаў | Тыпы |
|---|---|---|
| I | Брэсцкі, Гродзенскі, Магілёўскі Віцебскі, Мінскі | I |
| II | Слонімскі | |
| III | Чэрыкаўскі, Мсціслаўскі | |
| IV | Гомельскі, Бабруйскі, Мазырскі, Пінскі | II |
| V | Горацкі, Аршанскі | III |
| VI | Рагачоўскі, Сенненскі, Чавускі, Быхаўскі, Клімавіцкі | |
| VII | Рэчыцкі, Барысаўскі, Ігуменскі | |
| VIII | Полацкі, Слуцкі, Вілейскі, Дзісненскі, Дрысенскі Лепельскі | IV |
| IX | Кобрынскі, Пружанскі, Лідскі, Ашмянскі, Ваўкавыскі, Навагрудскі | |

Да другога тыпу (кластэр IV) аднесены найбольш развітыя ў прамысловых адносінах паветы Беларусі. Для іх характэрны самы высокі працэнт занятых у прамысловасці і доля фабрычна-заводскіх рабочых сярод іх. Гэта група ўступае толькі першай па ўдзельнай вазе чыноўнікаў і ваеннаслужачых (4,45 %), прадстаўнікоў вольных прафесій (1,625 %), асоб, занятых у гандлёвай сферы дзейнасці (6,8 %), у прыватнай службе, прыслугі, гарадскога насельніцтва. Разам з тым для дадзенага тыпу паветаў уласціва пры самым высокім працэнце сельскагаспадарчых жыхароў, занятых промысламі, найбольш нізкая доля занятых прамысловымі промысламі. Трэба адзначыць адваротную залежнасць гэтых двух паказчыкаў, што звязана са ступенню пранікнення капіталістычных адносін ва ўсе сферы гаспадаркі.

У трэці тып уключаны паветы ўсходняй часткі Беларусі (кластэры V—VII). Асноўныя рысы іх: самая высокая доля занятага ў сельскай гаспадарцы насельніцтва, найбольш слабая ступень разлажэння сялянства. Акрамя таго, для гэтага тыпу адзначана найменшая доля насельніцтва, задзейнічанага ў прамысловасці, і самая нізкая ўдзельная вага фабрычна-заводскіх рабочых (за выключэннем паветаў чацвёртай групы). Мі-

Таблiца 2

**Удзельная вага асобных катэгорый насельнiцтва па паветах Беларусi (%)**

| Тыпы паветаў | Сельскагаспадарчае насельнiцтва (з сем'ямi) | Сельскагаспадарчае насельнiцтва, занятае промысламi (самастойнае) | Сельскагаспадарчае насельнiцтва, занятае прамысловымi промысламi, сярод усяго сельскагаспадарчага насельнiцтва, занятага промысламi (самаст.) | Сяляне-беднякi | Заможныя сяляне | Адносiны колькасцi сялянства да колькасцi асоб, занятых у сельскай гаспадарцы (з сем'ямi) | Самастойнае насельнiцтва занятае ў прамысловасцi | Фабрычна-заводскiя рабочыя сярод усяго самастойнага насельнiцтва, занятага ў прамысловасцi | Гарадское насельнiцтва |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Сярэднiя значэннi паказчыкаў | | | | | |
| I | 60,7 | 11,08 | 52,58 | 65,9 | 3,4 | 104,56 | 15,82 | 9,48 | 28,68 |
| II | 72,225 | 27,9 | 31,0 | 62,6 | 6,95 | 97,7 | 16,05 | 12,175 | 11,65 |
| III | 81,67 | 17,86 | 42,32 | 40,49 | 11,81 | 100,1 | 9,07 | 8,21 | 5,04 |
| IV | 79,21 | 9,25 | 56,68 | 70,84 | 2,37 | 101,6 | 9,53 | 5,22 | 5,74 |
| | | | | Каэфiцыенты варыяцыi значэнняў паказчыкаў | | | | | |
| I | 3,8 | 20,8 | 13,2 | 58,7 | 102,2 | 7,7 | 7,7 | 73,8 | 22,4 |
| II | 3,7 | 30,4 | 50,6 | 33,5 | 62,5 | 8,3 | 14,8 | 38,1 | 37,7 |
| III | 7,1 | 26,1 | 55,6 | 60,7 | 65,1 | 9,3 | 22,7 | 37,8 | 42,9 |
| IV | 2,3 | 32,2 | 23,2 | 49,4 | 72,6 | 3,3 | 12,0 | 61,7 | 51,1 |

нiмальным, у параўнаннi з другiмi тыпамi, тут быў працэнт гараджан i непрадукцыйных пластоў насельнiцтва.

Для чацвёртай групы (кластэры VIII—IX), якая ўключае заходнiя i паўночна-заходнiя паветы Беларусi, характэрны: адзiн з самых высокiх працэнтаў жыхароў, занятых у сельскай гаспадарцы (уступае толькi трэцяму тыпу), найбольш глыбокая ступень расслаення сялянства i адзiн з найбольш высокiх паказчыкаў працэсу «рассяляньвання». Цiкава таксама, што ў гэтым рэгiёне была максiмальная для Беларусi ўдзельная вага сельскагаспадарчага насельнiцтва, занятага прамысловымi промысламi, пры мiнiмальнай—занятых промысламi ў цэлым. Акрамя таго, тут адзiн з самых нiзкiх працэнтаў гарадскiх жыхароў, чыноўнiкаў, прыслугi, падзёншчыкаў i найнiжэйшы—жыхароў, занятых у прамысловасцi, гандлi. Мiнiмальная ў гэтай групе таксама ўдзельная вага фабрычна-заводскiх рабочых, прадстаўнiкоў вольных прафесiй.

Да характарыстыкi тыпаў паветаў трэба дадаць, што працэс развiцця капiталiстычных адносiн у найбольшай ступенi адбiўся на сацыяльна-класавай структуры першай групы i менш за астатнiя закрануў трэцюю групу. Для другога тыпу паветаў уласцiва спалучэнне значнага ўплыву гэтага працэсу на развiццё сацыяльнай структуры гарадскога насельнiцтва i даволi слабага—у дачыненнi сельскага. У чацвёртым тыпе, наадварот, працэс капiталiзацыi адбiўся глыбей на складзе сельскага насельнiцтва i менш—на гарадскiм. Акрамя таго, належыць звярнуць увагу на тое, што трэцяя i чацвёртая групы аб'ядноўваюць тэрытарыяльна-сумежныя паветы i такiм чынам утвараюць адзiныя рэгiёны. Гэтая рыса ўласцiва i другому тыпу.

Паказчыкамi ступенi аднароднасцi сацыяльна-класавай структуры паветаў, якiя ўваходзяць як у адну групу, так i ў розныя, з'яўляюцца каэфiцыенты варыяцыi значэнняў прызнакаў (гл. табл. 2). Прыведзеныя ў таблiцы дадзеныя сведчаць пра аднароднасць сацыяльнага воблiку вылучаных тыпаў паветаў. Гэты вывад пацвярджаюць сярэднiя значэннi каэфiцыентаў варыяцыi для групы аб'ектаў па ўсiх паказчыках, нi адзiн з якiх не перавышае мяжу ў 30 % (першы тып—27,64 %, другi—23,06, трэцi—27,86, чацвёрты—29,18 %)[7].

Такiм чынам, вывучэнне статыстычных крынiц i апрацоўка iх з дапамогай шматмернага аналiзу дазваляе выявiць у сацыяльна-класавай структуры насельнiцтва Беларусi значныя адрозненнi ў рэгiянальным плане (выдзелены чатыры тыпы) i вызначыць дакладна тэрытарыяльныя межы iх iснавання. Адначасова апошняя выснова як iндыкатар сведчыць

аб існаванні адпаведных рэгіянальных адрозненняў у сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі, дакладнае вызначэнне якіх немалаважна для гістарычнай навукі.

У заключэнне належыць адзначыць, што пры вывучэнні сацыяльнай структуры насельніцтва Беларусі ў перыяд капіталізму важнай задачай з'яўляецца выяўленне асноўных фактараў, якія вызначаюць адрозненні насельніцтва беларускіх паветаў па такіх істотных характарыстыках, як пісьменнасць, ступень працэсу «рассяляньвання», распаўсюджанасць промыслаў сярод сельскагаспадарчых жыхароў, удзельная вага самастойнага насельніцтва [8]. Для вырашэння такой задачы звычайна выкарыстоўваецца рэгрэсіўны аналіз. Мэта яго — пабудаваць рэгрэсіўнае ўраўненне, каэфіцыент, якога дазваляе ацаніць «уклад» кожнага з фактараў, што маюць уплыў на варыяцыю аднаго з вынікальных (рэзультуючых) паказчыкаў, а таксама вызначыць спалучаны «ўклад» улічаных фактараў. (Гэта дасягаецца шляхам вылічэння каэфіцыента множнай карэляцыі). Прымяненне рэгрэсіўнага аналізу дазволіла зрабіць вывад, што, напрыклад, пры вывучэнні варыяцыі ўзроўню пісьменнасці найбольш істотнымі фактарамі з'яўляюцца: удзельная вага асоб, занятых прамысловымі промысламі, самастойнага насельніцтва, фабрычна-заводскіх рабочых, а таксама чыноўнікаў, ваеннаслужачых і асоб, занятых прыватнай службай.

[1] Пры апрацоўцы матэрыялу выкарыстаны праграмы шматмернага статыстычнага аналізу, распрацаваныя Л. І. Бародкіным.

[2] Гл.: Первая Всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г. СПб., 1900—1904. Вып. IV: Виленская губерния. Тетради 1—3; СПб., 1899—1903. Вып. V: Витебская губерния. Тетради 1—3; СПб., 1904. Вып. IX: Гродненская губерния; СПб., 1904. Вып. XXII: Минская губерния; СПб., 1903. Вып. XXIII: Могилевская губерния; Военно-конская перепись 1899—1901 гг. СПб., 1902.

[3] Ленін У. І.. Творы. Т. 3. С. 436.

[4] З прычыны абмежаванасці аб'ёму артыкула паказальнікі ў тэксце не пералічваюцца. Асноўныя з іх прыведзены ў табліцы 2.

[5] Бородкин Л. И. Многомерный статистический анализ в исторических исследованиях. М., 1986. С. 28.

[6] Гарадоцкі павет не ўвайшоў ні ў адзін кластэр. На ўзроўні вызначэння тыпаў з агульнай характарыстыкі «выпалі» яшчэ і Слонімскі, Чэрыкаўскі, Мсціслаўскі паветы, якія істотна адрозніваюцца па сваіх прызнаках ад выдзеленых груп аб'ектаў.

[7] Каэфіцыенты варыяцыі паказваюць ступень рассеяння значэнняў прызнакаў. Значэнні не вышэй за 30 % сведчаць аб аднароднасці груп аб'ектаў (паветаў), 30—50 % — аб задавальняючай ступені аднароднасці, вышэй за 50 % — аб адсутнасці яе.

[8] Тэрмін «самастойнае насельніцтва» («лица, имеющие самостоятельные занятия») узяты з матэрыялаў перапісу насельніцтва Расіі 1897 года. На думку І. Д. Кавальчанкі, да гэтай катэгорыі адносіліся ў асноўным галовы сямействаў.

Г. И. ДОВГЯЛО, А. А. ПРОХОРОВ

## К ВОПРОСУ ОБ ИСТОРИЧЕСКИХ ИСТОКАХ СЮЖЕТА БЕЛОРУССКОЙ СКАЗКИ «МАЛ-МАЛЫШОК»

Известным собирателем белорусского фольклора Е. Р. Романовым в конце прошлого века в местечке Старый Толочин у малограмотного крестьянина 42-х лет М. Федосова записана сказка «Мал-Малышок» (АТ 531-327В)[1]. Эта сказка содержит интересный набор мотивов часто встречающихся в Белоруссии сюжетов типа «Мальчик-с-Пальчик и ведьма»[2]. По мнению специалистов, русская сказка знает только усеченный вариант этого сюжета (АТ 327В)[3].

Кроме характерного для этого типа сказок набора мотивов чудесного рождения героя, его роста «не по дням, а по часам», наличия волшебных помощников, прежде всего коня, продвижения по царской службе после выполнения трудных задач и, наконец, воцарения после умерщвления старого царя и женитьбы на его невесте, сказка «Мал-Малышок» имеет интересные сюжетные подробности.

В этом сюжете мотив чудесного рождения героя имеет следующие особенности: у престарелой бездетной семьи из 31 птичьего яйца, собранного после вещего сна стариком из 30 гнезд, расположенных на 30 березах, рождается 31 сын: в одном гнезде оказалось сразу два яйца [4].

Как и в других вариантах сказок этого типа, первоначально герой занимает в сравнении с братьями явно приниженное положение: его не